Урокі гераізму
ў апавяданні Івана Навуменкі
“Настаўнік чарчэння”1957г.

Мэты:

- дапамагчы вучням зразумець галоўны пафас твора; пашырыць уяўленне вучняў пра тое, як раскрываюцца вобразы герояў у празаічным творы;
- садзейнічаць фарміраванню ў вучняў высакароднасці і жыццёвай мэтанакіраванасці;
- Выхоўваць павагу да людзей, якія самаадданa працуюць на карысць сваёй Радзіме.

Абсталяванне: вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для VII класа, прэзентацыя, праекты вучняў пра герояў сучаснасці, эпіграф.

Эпіграф:

Герой не славай, а справай сваёй
Заве за сабой праслаўляючы...
П. Броўка

Ход урока:

I. Арганізацыйна-матывацыйны момант.

На працягу ўрока дэманструецца мультымедыйная прэзентацыя. Спадзяюся, сёння ўрок будзе цікавым, павучальным і крыху незвычайным, таму што мы з вамі правядзём урок-праект.

На мінулым уроку мы пазнаёміліся з апавяданнем І. Навуменкі “Настаўнік чарчэння”. На сёння вы атрымалі дамашняе заданне: ахарактарызаваць Апалінарыя Феакціставіча.

II. Праверка дамашняга задання: адказваюць некалькі вучняў.

III. Гутарка з вучнямі:

Такім чынам, мы з вамі вызначылі, што галоўнымі героямі апавядання І. Навуменкі “Настаўнік чарчэння” з’яўляюцца настаўнік Апалінарый Феакціставіч і яго вучань Косця Кветка.

Скажыце, ці можна настаўнікачарчэння лічыць героем? (Да. Ён прысвячае сваё жыццё любімай справе, сваім вучня. Не здраджвае сабе, калі прыходзяць немцы. Ён аддае сваё жыццё за Радзіму)

Як вы разумееце слова “герой”? (Герой – той, хто здзяйсняе гераічныя ўчынкі)

Давайце звернемся да слоўніка іншамоўных слоў.

- Герой – храбры, самаадданы чалавек, які зрабіў, робіць подзвігі.
- Галоўная дзеючая асоба літаратурнага твора.
- Чалавек, які ўвасабляе тыповыя рысы свайго часу, эпохі, асяроддзя.
- Той, хто нечым вылучыўся, звярнуў на сябе ўвагу.

Як вы разумееце выраз “зрабіць гераічны ўчынак”? (Гэта значыць зрабіць нешта, чаго ніколі не рабіў раней. Гэта значыць аддаць сваё жыццё за кагосьці).

Ці можна ў наш час стаць героем? Хто можа быць сёння героем? (Можна. Сёння можна дапамагчы людзям, якія трапілі ў складаную сітуацыю. Можна дапамагчы пры пажары, калі гэта табе па сілах).

Назавіце прыклады праяўлення гераізму ў наш час.

Зварот да эпіграфа. Як вы разумееце радкі Петруся Броўкі?

IV. Мэтавызначэнне:

V. Праца з тэкстам:

Хто такі Косця Кветка? Што нам пра яго вядома? (Косця Кветка – вучань, які разам са сваімі аднакласнікамі не вельмі любіць вучыцца.)

Якою слабасцю Апалінарыя Феакціставіча любіў карыстацца Косця і ўвесь яго клас?(Вучні любілі загаворваць старога настаўніка на уроку, каб у іх не правяралі дамашняе заданне.)

Ці мяняліся адносіны дзяцей да настаўніка чарчэння на працягу твора?(Вучні раслі, і адносіны да настаўнікаў у іх мяняліся. Дзеці пачыналі прыслухоўвацца да настаўнікаў, бо набліжалася заканчэнне школы. І трэба было не толькі здаць экзамены па прадметах, але і стаць добрым грамадзянінам. А гэтаму і вучылі ў школе.)

Па якой прычыне Косця пакідаў школу, горад у сярэдзіне навучальнага года?

Які падарунак вырашылі зрабіць дзесяцікласнікі Косцю? (У сярэдзіне навучальнашга года Косця пакідаў школу і дом, бо паступіў у лётнае вучылішча. Яно знаходзілася ў другім горадзе, аж за Волгай. Паколькі гэта быў першы вучань, які тэрмінова закончыў школу, то клас вырашыў яму зрабіць паларунак – сярэбраную табакерку.)

Што за словы выгравірывалі вучні на табакерцы? (“Радзіму нашу любім і абараняць яе павінны”)

Які ўчынак здзейсніў Косця ў час вайны? (Косця скінуў некалькі бомб на чыгунку роднага горада, калі яго занялі немцы. Ён адхіліўся ад свайго маршрута, чым вельмі рызыкаваў. Пасля атроымаў і вымову ад начальства.)

Як у горадзе зразумелі, што гэта быў Косця?( Ён збросіў на горад вымпел, на якім былі словы на латыні.)

Што за надпіс быў на тканіне?(Гэта быў той самы надпіс, які калісьці да вайны Апалінарый Феакціставіч прапанаваў вучням зрабіць на табакерцы.)
Як склалася жыццё Косці пасля вайны?(Вярнуўшыся з вайны, Косця працаваў настаўнікам фізкультуры ў роднай школе, пазней скончыў інстытут і стаў настаўнікам фізікі.)
Ці можна назваць Косцю Кветку і Апалінарыя Феакціставіча героямі? Чаму? (Думаю, што можна назваць нашых дзейсных асоб героямі. Бо кожны з іх служыў Радзіме. Косця ў час вайны, а Апалінарый Феакціставіч не прайшоў міма несправядлівасці, не пабаяўся гаварыць праўду немцам. За што і паплаціўся сваім жыццём.)
Які гераічны ўчынак зрабіў Косця?( Па-першае, разбамбіў нямецкі эшалон, па-другое, працягнуў справу жыцця свайго настаўніка чарчэння.)
У пачатку ўрока вы сказалі, што героем можна стаць і ў наш час. А якіх герояў Беларусі вы ведаеце, што сваё званне атрымалі ў мірны час?( Уладзімір Карват, Дзмітрый Гвішыяні, Дарп’я Домрачава, Пётр Пракаповіч, Міхаіл Савіцкі…)
Імёны Уладзіміра Карвата і Дзмітрыя Гвішыяні звязаны з нашым горадам Брэстам. Таму давайце спынімся менавіта на іх постацях. Давайце паслухаем пра іх і пра ўчынкі, каторыя яны здзейснілі, і даведаемся, як сёння ўшанавана іх гераічная памяць. (зварот да прэзентацыі).
VII. Рэфлексія. Творчае заданне.
Слухаем на памяць верш Пімена панчанкі “Герой”
У вершы паказаны вобраз салдата, які пагібае на вайне за свабоду сваёй Радзімы. Але геройства салдата можна прачытаць і ў сучасным кантэксце. Героем можа стаць любы з вас. Той, хто не пройдзе міма чужой бяды, падтрымае ў цяжкую хвіліну.
Дык якім павінен быць чалавек-герой выкажыце свае думкі ў сінквейне.
Складанне сінквейна.
Герой
Мужны, адданы.
Абараняе, захоўвае, любіць.
Любому працягне руку дапамогі.
Гонар.
VIII. Падвядзенне вынікаў і выстаўленне адзнак.